# Мабільную сувязь палепшаць да II Еўрапейскіх гульняў

## Якасць мабільнай сеткі павысяць на чыгунцы, аўтамагістралях і ў Мінскім метрапалітэне

**Мабільная сувязь з'явіцца ў тунэлях сталічнага метро да пачатку II Еўрапейскіх гульняў. Пра гэта паведаміў кіраўнік тэхнічнага дэпартамента кампаніі «Мабільныя ТэлеСістэмы» Аляксей ЦЯЖКІХ. Акрамя таго, паводле слоў спецыяліста палепшыцца і сувязь на галоўных чыгуначных магістралях краіны.**

Падчас прэс-канферэнцыі ў БелТА, Аляксей Цяжкіх расказаў, што паляпшэнне якасці сувязі ў Мінскім метрапалітэне і забеспячэнне беспярэпыннай сувязі ва ўсіх тунэлях метро з'яўляецца важнай часткай падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў.

«Сёння гэта сумесны праект з іншым аператарам, які мы плануем рэалізаваць да гульняў. Вынікам будзе суцэльнае пакрыццё ўнутры вагонаў на ўсім працягу тунэляў Мінскага метрапалітэна», — адзначыў Аляксей Цяжкіх.

Каментуючы пытанне па паляпшэнні сувязі на чыгуначных магістралях, ён нагадаў, што з БЧ ужо рэалізаваны праект па забеспячэнні 19 чыгуначных вакзалаў краіны грамадскім Wi-Fi.

«Да II Еўрапейскіх гульняў у нас таксама запланавана будаўніцтва 51 аб'екта для чыгункі. Мы палепшым сувязь на асноўных шляхах, па якіх госці Еўрапейскіх гульняў будуць прыязджаць да нас», — сказаў Аляксей Цяжкіх.

Так, плануецца палепшыць якасць мабільнай сувязі на галоўных чыгуначных магістралях: Гомель — Жлобін — Асіповічы — Мінск — Маладзечна — Гудагай; Брэст — Баранавічы — Мінск — Орша; Жлобін — Магілёў — Орша — Віцебск — Езярышча. Усяго сувяззю накрыюць каля 1,3 тысячы км чыгуначных шляхоў.

Дадатковыя базавыя станцыі з'явяцца і уздоўж буйных магістраляў — каля сотні вышак, што забяспечаць якасны доступ да хуткаснага мабільнага інтэрнэту па тэхналогіі 3G па крытэры «ўнутры аўтамабіля».

Ёмістасць сеткі павялічаць і ў міжнародных пунктах пропуску, тут таксама запрацуюць новыя базавыя станцыі. Што датычыцца аэрапорта, то там ужо забяспечана стапрацэнтнае пакрыццё LTE трасы М2 Мінск — Нацыянальны аэрапорт Мінск. Сувяззю чацвёртага пакалення абаненты МТС могуць карыстацца і ў будынку аэрапорта.

Для забеспячэння максімальна якаснага пакрыцця і высокіх хуткасцяў перадачы інфармацыі ў час правядзення II Еўрапейскіх гульняў сетка МТС ужо гатова для аўтаматычнага пераразмеркавання трафіка падчас пікавых нагрузак.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Прыёмная кампанія — 2018

# БОЛЬШ ЯК ПАЎСОТНІ СТАБАЛЬНІКАЎ

## 100-бальныя сертыфікаты па выніках ЦТ па рускай мове атрымаюць сёлета 54 чалавекі

**Нагадаем, што гэты прадмет быў самым масавым — яго здавалі амаль 67 тысяч чалавек. Летась стабальнікаў на ЦТ па рускай мове было 66.**

Менш за 10 балаў на тэсце па рускай мове набралі сёлета 4,5 працэнта ад агульнай колькасці ўдзельнікаў экзамену (2 906 абітурыентаў), гэта значна менш, чым у папярэднім годзе, калі ніжні парог не пераадолелі 7,6 % тых, хто паступаў (5 527 чалавек.) Сярэдні бал па прадмеце склаў 37,6 (у 2017 годзе — 34,64). На нуль балаў рускую мову напісалі шэсць чалавек (летась такіх было аж 17).

Фактычна цэнтралізаванае тэсціраванне ўжо перасягнула свой экватар. Абітурыентам засталося здаць толькі тры дысцыпліны: гісторыю Беларусі (28 чэрвеня), геаграфію (30 чэрвеня) і сусветную гісторыю навейшага часу (2 ліпеня).

**Рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ў рэзервовы дзень будзе весціся з 30 чэрвеня да 3 ліпеня.**

Арганізатары ЦТ папярэджваюць: да здачы тэст-іспытаў у рэзервовы дзень будуць дапушчаны толькі тыя абітурыенты, якія змогуць даказаць, што ў іх былі сур'ёзныя прычыны для пропуску экзамену (напрыклад, прад'явіць даведку пра сваю хваробу). Калі абітурыенты ўдзельнічалі ў ЦТ у асноўны дзень, але не змаглі дапісаць сваю работу з-за пагаршэння стану здароўя, яны таксама змогуць скарыстацца рэзервовым днём.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ПАМЁР ПАЭТ АНДРЭЙ ДЗЯМЕНЦЬЕЎ



Толькі некалькі тыдняў ён не дажыў да 90-годдзя. Як адзначае «Інтэрфакс», Дзяменцьеў памёр ад працяглай хваробы. Аб шпіталізацыі паэта стала вядома 10 чэрвеня. Тады яго жонка Ганна Пугач растлумачыла, што падставай для звароту да ўрача стала прастуда.

Многія вершы Дзяменцьева былі пакладзены на музыку. На сцэне іх выконвалі Людміла Зыкіна, Яўген Мартынаў, Вадзім Мулерман, Сафія Ратару. Асаблівую любоў сярод прыхільнікаў творчасці Дзяменцьева заваявалі вершы «Алёнушка», «Лебядзіная вернасць», «Бацькоўскі дом», «Балада аб маці». Бывайце, Андрэй Дзмітрыевіч...

### ЛІЗАВЕТА II ЗАЦВЕРДЗІЛА ЗАКОН АБ BREXIT

Каралева Вялікабрытаніі Лізавета II ухваліла законапраект аб Brexit, надаўшы яму тым самым статус закона. Прымяняцца новы закон пачне пасля выхаду Вялікабрытаніі з ЕС 29 сакавіка 2019 года. «Я павінен паведаміць палаце абшчын, што ў адпаведнасці з законам аб каралеўскім адабрэнні ад 1967 года, Яе Вялікасць падаравала сваю каралеўскую згоду законапраекту аб выхадзе Вялікабрытаніі з ЕС», — абвясціў спікер ніжняй палаты парламента Джон Беркаў. Палата лордаў брытанскага парламента канчаткова зацвердзіла ўрадавы варыянт законапраекта аб выхадзе Злучанага Каралеўства з ЕС 20 чэрвеня. Лорды ўхвалілі законапраект простай большасцю, без правядзення працэдуры галасавання. Гэта рашэнне паклала канец спробам унесці ў дакумент папраўкі, якія надзяляюць парламент паўнамоцтвамі па змене ўмоў Brexit або адмене выхаду з Еўрасаюза ў выпадку немагчымасці заключэння пагаднення з Брусселем.

### СТАРШЫНЁЙ ПАСЕ СТАЛА ЛІЛІЯН МАРЫ ПАСК'Е

Швейцарскі парламентарый Ліліян Мары Паск'е зацверджана на пасадзе старшыні Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ). Аб гэтым абвешчана на адкрыцці чэрвеньскай сесіі асамблеі ў Страсбургу. Зацвярджэнне новага кіраўніка ПАСЕ на пасадзе прайшло без галасавання. Паск'е была адзіным прэтэндэнтам на гэтую пасаду, і яе кандыдатура была ўхваленая апладысментамі дэпутатаў. Паск'е прадстаўляе парламенцкую групу «Сацыялісты, дэмакраты і «зялёныя». На пасадзе старшыні ПАСЕ швейцарскі палітык прыйшла на змену свайму італьянскаму калегу па сацыялістычнай фракцыі Мікеле Нікалет, які займаў гэтую пасаду са студзеня 2018 года. Складці паўнамоцтвы Нікалет быў вымушаны пасля таго, як не здолеў пацвердзіць дэпутацкі мандат у Італіі, пацярпеўшы паразу ў сваёй акрузе на праведзеных у краіне ў сакавіку парламенцкіх выбарах. Такім чынам, яго знаходжанне на пасадзе старшыні ПАСЕ сталася самым кароткачасовым у гісторыі.

### ЗША ХУТКА ПРАДСТАВЯЦЬ КНДР ГРАФІК ДЭНУКЛЕАРЫЗАЦЫІ



ЗША ў найбліжэйшы час прадставяць КНДР план-графік рэалізацыі дамоўленасцяў па дэнуклеарызацыі Карэйскага паўвострава, дасягнутых 12 чэрвеня на саміце ў Сінгапуры паміж лідарамі дзвюх краін. Пра гэта паведаміў прадстаўнік Пентагона, які суправаджае міністра абароны Джэймса Мэціса ў паездцы на Аляску. Прадстаўнік Пентагона не стаў дзяліцца дэталямі, але даў зразумець, што прапанаваныя тэрміны ліквідацыі ядзернай праграмы КНДР не будуць працяглымі. Як заявіў журналістам дзяржсакратар Майкл Пампеа падчас візіту ў Сеул на наступны дзень пасля саміту ў Сінгапуры, Вашынгтон спадзяецца на тое, што працэс дэнуклеарызацыі будзе ў цэлым завершаны на працягу двух або двух з паловай гадоў, гэта значыць да канца прэзідэнцкага тэрміну Дональда Трампа.

■ «Я зноў выбіраю «Звязду»

# І гэта ўжо назаўсёды



**...Люблю чытаць гэту рубрыку. Люблю тых, хто любіць маю газету. Асабліва калі гэта — людзі высокага рангу. Спадара Марзалюка, напрыклад, за яго веды і пазіцыю, за яго заўсёдную беларускасць. Не дзіва, што ён выбірае... Але было б добра, каб «Звязду» выбіралі ўсе асобы такога ўзроўню, бо ёсць за што.**

Я асабіста ў захапленні ад своечасовасці матэрыялаў, ад адсутнасці пустога пафасу: уся інфармацыя падаецца не назойліва, роўна, можна сказаць, у стылі нацыянальнай ментальнасці.

Карысная «Звязда» і ў практычным плане. Я да сёння карыстаюся падказкамі з «Хатняй энцыклапедыі», з «Саду і агароду» часоў спадара Чахоўскага. Бяру да ведама і парады з «Крынічкі». Ім можна давяраць. Кажу гэта як чалавек дасведчаны.

Мая ўвага — «Ігуменскаму тракту», «Слоўніцы», «Сямейнай газеце», «Неасабістаму суб'ектыву», «Нефармату», «Зваротнай сувязі», «Мясцоваму самакіраванню», само сабой — здымкам Анатоля Клешчука і хоць зрэдку — уласным у звяздоўскім «Надвор'і».

Падабаецца, што газета заўсёды ў дыялогу з маладымі. Уяўляю, як важна ім убачыць на старонках свае прозвішчы, нумар школы... Гэта, думаю, павышае самапавагу, уплывае на выбар прафесіі, на далейшае жыццё.

Няма, відаць, падпісчыкаў, якія не любілі б рубрыкі Валянціны Доўнар. Яны ствараюць настрой, і я ўяўляю, як добра было б убачыць чарговы "збор твораў" з «Простай мовы» альбо першы з «...Народа на праводзе».

Што яшчэ? Выпісваць і чытаць «Звязду» для мяне падзея, можна сказаць — рытуал. А вось у латарэі і сапраўды ніколі не шчасціла... Праўда, і карткі я дасылала рэдка... А мне зусім няважна, будзе той прыз ці не. Мне важна чытаць «Звязду», самую народную з газет, бо яна — на мове народа.

Я абрала яе гадоў 30 таму — раз і ўжо назаўсёды.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**

*в. Лучын, Рагачоўскі раён*

■

# За клопат пра радзіму

## Зорка ганаровага грамадзяніна Магілёва — у гонар беларускага і расійскага пісьменніка

Валерыя Казакова добра ведаюць у Беларусі. Ураджэнец Магілёўшчыны, большую частку свайго жыцця ён звязаў з Расіяй. Вайсковец, журналіст, вучоны-сацыёлаг, работнік Адміністрацыі прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, паэт і празаік — на ўсіх пасадах, ва ўсіх сваіх сацыяльных і творчых статусах ён апекаваўся і апякуецца клопатамі пра сваю радзіму, пра тыя мясціны, што вывелі яго ў шырокі свет. Як адзнака такой руплівасці земляка — наданне яму звання ганаровага грамадзяніна Магілёва.

Дарэчы, гораду, яго ваколіцам, людзям Магілёва і Магілёўшчыны прысвечана і адна з кніг Валерыя Казакова — «Горад, які заўсёды са мной». Выдадзена яна ў Беларусі — у Выдавецкім доме «Звязда». На свяце горада 29 чэрвеня расійскаму і беларускаму літаратару не толькі ўручаць пасведчанне, але яшчэ і адкрыюць імянную зорку ў гонар пісьменніка і мецэната на плошчы Зорак.

Валерый Мікалаевіч Казакоў зрабіў нямала добрых спраў дзеля захавання гісторыка-асветніцкіх традыцый, прыняў асабісты ўдзел у збіранні і набыцці для Магілёўскага абласнога гістарычнага музея многіх беларускіх артэфактаў. Кнігі нашага земляка на рускай, беларускай, у перакладзе на іншыя мовы выдадзены ў Беларусі і Расіі, Польшчы і Чарнагорыі, Сербіі і іншых краінах свету. Асаблівы розгалас займеў нядаўна выдадзены раман «Чорны кот» (Мінск, «Харвест»), у якім спалучыліся гісторыя і сучаснасць. Раман настолькі рэльефны і дынамічны праз вобразы, мастацкія дэталі, за якімі стаяць рэальныя жыццёвыя калізіі, што варта было б айчыннаму кінематографу звярнуць на яго сур'ёзную ўвагу.

Яшчэ раней за пісьменніцкую і грамадскую дзейнасць Валерый Казакоў, які з'яўляецца і старшынёй ФНКА «Беларусы Расіі», быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

**Сяргей ШЫЧКО.**

### Да ведама членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Пасяджэнні чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання адбудуцца ў зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) 28 чэрвеня 2018 г. у 16.00 і 29 чэрвеня 2018 г. у 14.00.**